## 2024 г. – 70 гадоў з часу адкрыцця дзяржаўнай установы адукацыі ў сферы культуры ««Дзіцячая школа мастацтваў г. Кобрына» (1954)



Дзіцячая школа мастацтваў г. Кобрына – гэта дзяржаўная ўстанова адукацыі ў сферы культуры, якая рэалізуе адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

У 1954 годзе Кобрынскі раённы Савет дэпутатаў (старшыня С. А. Камендант) і Кобрынскі гарадскі выканаўчы камітэт (старшыня Б. Р. Ільясюк) прынялі рашэнне аб адкрыцці ў гістарычным цэнтры Кобрына, на плошчы Камсамольцаў, дзіцячай музычнай школы. Адкрыццё школы стала для горада важнай падзеяй – адораныя дзеці атрымалі магчымасць вучыцца музычнай грамаце. Першым дырэктарам школы стаў Уладзімір Аляксеевіч Ястрэмскі, педагагічны састаў школы налічваў усяго восем чалавек. Першыя вучні асвойвалі домру, баян і фартэпіяна.

За гэтыя гады ў жыцці школы адбылося мноства зменаў: назва, структура, кіраўнікі, педагагічны састаў, навучэнцы. І толькі адно засталося нязменным – імкненне да развіцця і ўдасканалення сістэмы музычнай адукацыі. У 1998 годзе Кобрынская дзіцячая музычная школа змяніла свой статус і адрас. Яна размясцілася ў новым сучасным будынку, пабудаваным па спецыяльным праекце па вуліцы Гастэлы, 20. Будынак уражвае не толькі сваёй архітэктурай, але і інтэр’ерам.

З адкрыццём харэаграфічнага аддзялення музычная школа пераўтворана ў школу мастацтваў. 18 лістапада 2011 года ў адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў праведзена рэгістрацыя ДУА «Дзіцячая школа мастацтваў г. Кобрына». Павялічылася колькасць вучэбных класаў (у новай школе іх больш за 40), а гэта ў сваю чаргу дазволіла павялічыць колькасць навучэнцаў.

Сёння адукацыйная ўстанова працуе па двух напрамках дзейнасці: музычным і харэаграфічным. Музычны напрамак прадстаўлены харавым і інструментальным аддзяленнямі. Навучанне вядзецца на 16 музычных інструментах. У Кобрынскай ДШМ штогод навучаюцца больш за 600 навучэнцаў, у іх ліку ўдзельнікі, лаўрэаты і дыпламанты абласных, рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў, конкурсаў і алімпіяд, стыпендыяты Прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі. Працуюць таксама падрыхтоўчыя групы, куды прымаюцца дзеці ва ўзросце 6–8 гадоў для падрыхтоўкі да паступлення на інструментальнае або харэаграфічнае аддзяленні (тэрмін навучання 1 год), і групы паскоранага навучання, у якія прымаюцца дзеці на ўсе спецыяльнасці ва ўзросце ад 10 гадоў (тэрмін навучання 1–3 гады).

Дзейнічаюць 6 педагагічных і 14 дзіцячых творчых калектываў, тры з якіх носяць званне ўзорных, адзін – народнага. Узорны хор «Купалінка» (утвораны ў 1992 годзе) – лаўрэат і дыпламант розных фестываляў і конкурсаў, у тым ліку і міжнародных. У рэпертуары калектыву творы беларускіх кампазітараў, харавая класіка, апрацоўка народных песень, духоўная музыка, творы рускіх і замежных кампазітараў, перакладанні для хору песень поп і рок музыкі. У 1993 годзе утвораны ўзорны баянны аркестр, у рэпертуары якога апрацоўкі народных песень і танцаў розных народаў, эстрадная музыка. Узорны ансамбль народнай песні і музыкі «Таўкачыкі» працуе з 2003 года і эксклюзіўнасць яго ў тым, што многія выкананыя песні, танцы і інструментальныя творы – узоры рэгіянальнага фальклору, сабранага кіраўніком «Таўкачыкаў» у фальклорных экспедыцыях. Усе ўзорныя калектывы вядуць актыўную канцэртную дзейнасць.

У аркестры народных інструментаў, які вядзе сваю гісторыю з 1977 года і носіць званне «народны», звыш 40 прафесійна падрыхтаваных музыкантаў з ліку настаўнікаў школы, якія граюць на домрах, балалайках, цымбалах, гуслях, баянах, духавых і ўдарных інструментах.

На працягу існавання школы яе кіраўнікамі былі Эльвіра Сяргееўна Кузьміна, Яўгеній Іванавіч Пракапюк, Анатолій Ільіч Кастына (1987–2002). З 2002 года дырэктарам школы з’яўляецца Сяргей Рыгоравіч Рэбкавец. С. Р. Рэбкавец неаднаразова выбіраўся дэпутатам, па выніках працы за 2021 год быў занесены на Дошку гонару Кобрынскага раёна.

Калектыў Кобрынскай ДШМ сур'ёзна і адказна адносіцца да навучальнага працэсу, імкнецца трымаць высокую планку паказчыкаў. Сённяшні педагагічны калектыў школы – гэта высокапрафесійны калектыў, які пастаянна ўдасканальвае педагагічнае майстэрства. Галоўнымі прыярытэтамі ў працы з'яўляюцца: далучэнне дзяцей да музычнай культуры, навучанне гульні на музычных інструментах, выяўленне найбольш таленавітых і здольных вучняў і мэтанакіраваная педагагічная работа з мэтай іх падрыхтоўкі да паступлення ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы культуры і мастацтва; прыцягненне для працы ў школу высокакваліфікаваных выкладчыкаў.

Школа мастацтваў – адзін з вядучых культурна-асветніцкіх цэнтраў Кобрына, дзе выступаюць лепшыя творчыя калектывы, праходзяць гарадскія і раённыя мерапрыемствы. Установа вядзе шырокую канцэртную дзейнасць на сцэнічных пляцоўках г. Кобрына і за яго межамі, прымае актыўны ўдзел у фестывалях і конкурсах.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Кобринский** образцовый ансамбль народной песни и музыки «Таўкачыкі» // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 474 : фат.

**Калектывы** дзіцячай школы мастацтваў г. Кобрына // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 506. – (Народныя і дзіцячыя ўзорныя калектывы).

**Кобрынская** музычная школа // Мастацтва Савецкай Беларусі : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 2 т. – Мінск, 1976. – Т. 1 (1917-1941). – С. 61.

**Юбілейныя** даты ўстаноў культуры і ўстаноў асветы ў сферы культуры. Дзяржаўнай установе адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г. Кобрына» (1954) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 151.

**Елизарова, Ж**. Семь столетий Кобрина / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2024. – 10 жніўня (№ 32). – С. 4. : фат.

На Кобринщине осуществляет свою деятельность 57 объектов, в числе которых Кобринская детская школа искусств.

**Бакун, Е.** С гармонией в душе / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2022. — 28 верасня (№ 74). — С. 1, 5 : фот.

О директоре ГУ "Детская школа искусств города Кобрина" Сергее Ребковце, занесенном по итогам работы за 2021 год на Доску почета Кобринского района.

**Голод, Е.** Мастер своего дела / Елизавета Голод // Кобрынскі веснік. - 2021. — 21 ліпеня (№ 57). — С. 8 : фот.

О работе мастера-настройщика музыкальных инструментов по рассказу педагога Кобринской детской школы искусств В. Н. Сычева.

**Вовк, Ю.** Дух творчества и музыки всегда с Ираидой Карлицкой / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2020. — 17 сентября (№ 38). — С. 4 : фот.

Педагог по классу фортепиано Кобринской школы искусств И. В. Карлицкая отметила 90-летний юбилей.

**Елизарова, Ж.** Служить высокому искусству / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 22 ліпеня (№ 56). — С. 4 : фот.

В ГУО "Детская школа искусств г. Кобрина" обучается более 600 учащихся.

**Савчук, М**. Новые достижения юных музыкантов / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. — 26 ноября (№ 48). — С. 2 : фот.

Воспитанники детской школы искусств г. Кобрина учавствуют в различных конкурсах и фестивалях.

**Горудко, Т. Г.** В царстве музыки и танца / [Татьяна Горудко ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 3 октября (№ 40). — С. 2 : фот.

Беседа с заместителем директора по учебно-воспитательной работе Кобринской детской школы искусств Татьяной Горудко.

**Бялоў, Д.** Танец для скрыпкі з аркестрам / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2018. — 13 кастрычніка. — С. 3.

У Кобрынскай дзіцячай школе мастацтваў існуе дзіцячы камерны аркестр.

**Каста** недатыкальных? Не, яны таксама ратуюць свет! : [анлайн-канферэнцыя газеты "Культура"] / [прымалі ўдзел: Н. Жук, С. Рэбкавец, К. Кісялёва. Р. Матвейчук, Т. Печкар ; гутарыў] Я. Рагін // Культура. - 2018. — 17 лістапада (№ 46). — С. 10—11.

Сярод удзельнікаў канферэнцыі аб праблемах школ мастацтваў С. Рэбкавец.

**Шлойда, И.** Мы за мир без войны / Ирина Шлойда // Кобрин-информ. - 2018. —3 мая. — С. 2.

Воспитанницы школы искусств А. Курилович и Т. Вакулич представляли Кобринщину на областном открытом конкурсе патриотической песни.

**Голод, Е**. И музыка наполнила сердца / Елизавета Голод // Кобрин-информ. - 2017. — 9 марта. — С. 2.

В Кобринской школе искусств прошел отчетный концерт детского образцового баянного оркестра.

**Дубіна, Л**. Вікторыя Вяржбіцкая: "Жыццё такое хуткацечнае" ... / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2017. — 15 сакавіка. — С. 8.

Настаўніца дзіцячай школы мастацтваў, актыўная і ініцыятыўная кабрынчанка В. Вяржбіцкая адзначыла 50-гадовы юбілей.

**Жук, Е.** Школа искусств в новом проекте / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2017. — 6 октября. — С. 7.

Кобринская школа искусств примет участие в культурном проекте о трехстороннем партнерском сотрудничестве.

**Не оскудеет** талантами Кобринщина! // Кобрынскі веснік. - 2017. — 12 красавіка. — С. 3.

Учащийся Кобринской школы искусств, лауреат многих международных конкурсов, аккордеанист Д. Никанович получил поощрение Специального фонда Президента РБ.

**Пашковіч, Л.** Лепшы сябар — акардэон / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 21 снежня. — С. 8.

Таленавіты навучэнец Кобрынскай дзіцячай школы мастацтваў Д. Ніканові мае дыпломы міжнароднага ўзроўню.

**Федаровіч, І.** Вечар класічных дуэтаў / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 23 сакавіка. — С. 5.

У Кобрынскай школе мастацтваў прайшоў вечар класічнай музыкі.

**Белов, Д.** Волшебная невидимая нить / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2015. — 11 лістапада. — С. 8.

О певице и преподавателе Кобринской детской школы искусств О. Каминской.

**Дубіна, Л.** Дзякуй вам, настаўнікі! / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015. — 7 кастрычніка. — С. 5.

У Кобрынскай дзіцячай школе мастацтваў адбылося ўрачыстае мерапрыемства па святкаванню Дня настаўніка.

**Савчук, М.** Музыкальные искры зажигали зал / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2015. — 8 января. — С. 5.

О праздновании 60-летнего юбилея школы искусств.

**Савчук, С.** На гастроли - в Польшу / Светлана Савчук // Кобрынскі веснік. - 2015. — 7 кастрычніка. — С. 8.

Детский академический хор "Купалинка" Кобринской детской школы искусств принял участие в проекте Евросоюза "Мост голосов" в Польше.

**Белов, Д.** Абсолютный успех! / Дмитрий Белов ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2014. — 27 снежня. — С. 10.

В детской школе искусств состоялся юбилейный концерт.

**Белов, Д.** Здесь учат видеть красоту / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2014. — 17 снежня. — С. 3.

Кобринская школа искусств отмечает 60-летний юбилей.

**Белов, Д**. С ключом серебряным от таинства души / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2014. — 11 кастрычніка. — С. 1,2.

О преподавателе Кобринской школы искусств, руководителе оркестра народных инструментов А. Новике.

**Браво,** Дима! // Кобрин-информ. - 2014. — 14 марта. — С. 1.

Юный аккордеанист Дмитрий Никанович на международном конкурсе удостоен диплома 1 степени.

**Бялоў, Д.** З думкамі аб новых перамогах / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. - 22 снежня. - С. 2.

**Ребковец, У**. Поздравляем победителей! / Ульяна Ребковец // Кобрин-информ. - 2012. - 19 апреля. - С. 31.

Среди победителей областного тура республиканского конкурса исполнителей на народных инструментах им. Жиновича – учащиеся Кобринской детской школы искусств.

**Бялоў, Д.** Калі Дзюймовачка размаўляе па-французску... : добрая традыцыя / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. - 31 кастрычніка. – С. 1-2.

Чацвёрты раз Кобрынская школа мастацтваў прымае замежных гасцей з французскага горада Сан-Дызье.

**Белов, Д.** Классика не стареет! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2009. - 7 лютага. - С. 8.

В Кобринской школе искусств проходит концерт «Музыка советских композиторов. XX век».

**Белов, Д**. Как всегда - аншлаг! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2008. - 24 снежня. - С. 5.

В Кобринской школе искусств прошел отчётный концерт.

**Вержбицкая, В**. Сен-Дизье - Кобрин - Сен-Дизье. Маршрут пятилетней дружбы / Виктория Вержбицкая // Кобрин-информ. - 2008. - 24 апреля. - С. 18.

Французская делегация уже не раз была гостями Кобринской школы искусств.

**Тимошук, Л.** Когда музыка - смысл жизни / Лариса Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2007. - 26 верасня. - С. 6.

Преподаватель скрипки Г. А. Нестерович уже 44 года преподает в детской школе искусств г. Кобрина.

**Новые** победы музыкантов школы искусств // Кобрин-информ. – 2006. – 2 марта. – С. 7.

**Вержбицкая, В**. Весна успехов и побед / Виктория Вержбицкая // Кобрин-информ. – 2005. – 5 мая. – С. 3.

Кобринская школа искусств.

**Вержбицкая, В**. Оранжерея талантов / Виктория Вержбицкая // Кобрин-информ. – 2004. – 13 мая.

Кобринской детской школе искусств – 50 лет.

**Вержбицкая, В**. Первые ласточки класса хореографии / Виктория Вержбицкая // Кобрин-информ. – 2004. – 10 июня. – С. 3.

Первый выпуск отделения хореографии школы искусств.

**Дзіцячай** школе мастацтваў – 50 год // Кобрынскі веснік. – 2004. – 5 мая. – С. 1.

**Пятроўская, М**. Кабрынчане – лепшыя / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2003. – 12 сакавіка. – С. 3.

Першае і другое месца ў абласным туры 7-га рэспубліканскага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя Жыновіча занялі выхаванцы Кобрынскай дзіцячай школы мастацтваў.

**Кобрынскі** школьнік выклікаў фурор на фестывалі / па матэрыялах БелТа // Настаўніцкая газета. – 2002. – 19 лістапада. – С. 4.

Сапраўдны фурор выклікаў на Х міжнародным фестывалі духоўнай музыкі у полькім горадзе Бохня выхаванец Кобрынскай дзіцячай школы мастацтваў А. Гелах .

**Славин, В.** Белорусский золотой голос – так называют 13-летнего Александра Гелаха из Кобрина / Виктор Славин // Заря. – 2002. – 29 октября. – С. 1 : фот.

**Хільчук, М.** З Польшчы – з найвышэйшай узнагародай і дыпломам / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2002. – 12 кастрычніка. – С. 6 : фат.

На юбілейным фестывалі духоўнай музыкі ў г. Бохця (Польшча) уладальнікам "Гран-пры" стаў А. Гелах.

**45 музычных** гадоў // Кобрынскі веснік. – 1999. – 22 мая.

**Стук** малатка і спеў скрыпкі // Кобрынскі веснік. – 1998. – 16 верасня (№ 73). – С. 2 : фат.

Аб адкрыцці школы мастацтваў у г. Кобрыне.

**Музычнай** школе – 40 гадоў // Кобрынскі веснік. – 1994. – 28 снежня (№ 102). – С. 1.

**Кузьміна, Э.** Дзесяць музычных год // Камуністычная праца. – 1965. – 7 января.

Аб Кобрынскай музычнай школе.

**Кобрынскі раён**

**Кобрын**

**Кобрынская дзіцячая школа мастацтваў**

**Школы мастацтваў**

**Установы адукацыі**